# УСТАЎНАЯ ГРАМАТА

## РАДЫ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ.

Год назад народы Беларусі разам з народамі Расіі скінулі ярмо расійскага царызму, які найцяжэй прыцicнуў быў Беларусь; ні пытаючыся народу, ён укінуў наш край у пажар вайны, якая чыста зруйнавала гарады і вёскі беларускіе.

Цяпер мы, Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, скідаем з роднаго краю апошняе ярмо дзяржаўнай залежнасьці, якое гвалтам накінулі расійскіе цары на наш вольны і незалежны край.

Ад гэтаго часу **Беларуская Народная Рэспубліка абвешчаецца Незалежнай і Вольнай Дзяржавай.** Самі народы Беларусі, у асобі свайго **Устаноўчаго Сойму**, пастановяць аб будучых дзяржаўных зьвязях Беларусі.

На моцы гэтаго траціць сілу усе старыя дзяржаўныя зьвязі, якія далі магчымасьць чужому ураду падпісаць і за Беларусь трактат у Берэсьці, што забівае на сьмерць беларускі народ, дзелючы зямлю яго на часткі.

На моцы гэтаго урад Беларускай Народнай Рэспублікі мае увайсьці у адносіны з зацікаўленымі старанамі, прапануючы ім пераглядзіць тую часьціну **Берэсьцейскаго Трактату**, якая датычыць Беларусі, і падпісаць міравую умову з усімі ваеваўшымі дзяржавамі.

Беларуская Народная Рэспубліка павінна абняць усе землі, дзе жыве і мае лічбенную перавагу беларускі народ, а ласьне: **Магілеўшчыну, беларускія часьці Меншчыны, Гродзеншчыны (з Гродной, Беластокам і інш.), Віленшчыны, Віцебшчыны, Смаленшчыны, Чарнігоўшчыны і сумежныя часьці суседніх губерняў, заселеныя беларусамі.**

Беларуская Народная Рэспубліка пацьвярджывае усе тыя правы і вольнасьці грамадзян і народаў Беларусі, якія абвешчаны **Устаўной Граматай ад 9 сакавіка 1918 году.**

Абвешчаючы аб незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі, Рада яе пакладае свае надзеі на тое, што **усе любячые волю народы** дапамогуць беларускаму народу у поўнай меры здзейсьніць яго палітычна-дзяржаўные ідэалы.

**Рада Беларускай Народнай Рэспублікі.**

Дана у Менску-Беларускім
25 сакавіка 1918 году.